# НавінЫ

БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

нумар 13 (30) 25 лістапада 2000 г.

# ЭЎРОПА ВІТАЕ СВАБОДНУЮ Й НЕЗАЛЕЖНУЮ БЕЛАРУСЬ

***З 13 па 19 лістапада адбыўся візыт лідэраў аб'яднанай апазыцыі ў краіны Ўсходняй Эўропы. Беларуская дэлегацыя ў складзе Вінцука Вячоркі (Партыя БНФ), Анатоля Лябедзькі (АГП), Аляксея Караля (БСДП) і Андрэя Саньнікава (Хартыя'97) наведала асноўныя эўрапейскія сталіцы. Мэта – зь першых вуснаў паінфармаваць эўрапейскіх палітыкаў пра пасьпяховую кампанію байкоту выбарчага фарсу й абмеркаваць пэрспэктыву дэмакратычных пераўтварэньняў на прэзыдэнцкіх выбарах у 2001 г.***



*Падчас сустрэчы з Хаўерам Салянам.*

Беларускіх лідэраў на працягу гэтых дзён прымалі Эўрапейская камісія, Эўрапарлямэнт і Рада Эўропы, парлямэнты й міністэрствы замежных справаў Францыі, Нямеччыны й Вялікабрытаніі.

У зьвязку з мэтай візыту ў розных краінах закранаўся шэраг пытаньняў унутранай і зьнешняй палітыкі Беларусі. Асабліва заходніх калегаў цікавіла адзінства дэмакратычных сілаў, кампанія байкоту выбараў, вылучэньне адзінага кандыдата – варункі, зь якіх выцякае агульнае стаўленьне Эўразьвязу да падзеяў у Беларусі. Беларускія лідэры давялі да заходніх калегаў, што ў Беларусі набыты багаты досьвед працы аб'яднанай апазыцыі, што надае рэальны шанец захаваць адзінства і вылучыць аднаго кандыдата на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 г.

Турнэ распачалося 13 лістапада сустрэчай у Парыжы. Прадстаўнікоў беларускага дэмакратычнага руху прымала кіраўніцтва дэпартамэнту Ўсходняй Эўропы францускага МЗС. У гэты ж дзень адбылася сустрэча ў Брусэлі з камісарам Эўрапейскага Зьвязу па міжнароднай палітыцы Крысам Паттэнам.

Сп. Паттэн – вельмі ўплывовая пэрсона ў палітыцы – высока ацаніў факт адзінства беларускай апазыцыі і асабліва падкрэсьліў, што Эўразьвяз будзе працягваць ціск на рэжым Лукашэнкі, каб прэзыдэнцкія выбары у 2001 годзе былі сапраўды свабодныя й незалежныя. Гэтак званая палата прадстаўнікоў ня будзе прызнаная, і, як запэўніў К. Паттэн, Эўропа абяцае падтрымку справе дэмакратыі ў Беларусі. Падчас размовы былі праведзеныя некаторыя паралелі між Беларусьсю й Сэрбіяй.

14 лістапада Вінцук Вячорка, Анатоль Лябедзька, Аляксей Кароль і Андрэй Саньнікаў наведалі Бэрлін. У Бундэстагу яны сустрэліся зь кіраўніцтвам і сябрамі Германа-беларускай парлямэнцкай групы (Ута Цапф, Вольфганг Бэрэндт і іншыя дэпутаты), а ў Міністэрстве замежных справаў беларускую дэлегацыю прыняў дзяржаўны міністар д-р Крыстаф Цёппэль. Бакі абмяняліся думкамі пра новую сытуацыю ў Беларусі, якая склалася пасьля краху спадзеваў Лукашэнкі на прызнаньне выбараў 15 кастрычніка, а таксама пра дэмакратычную пэрспэктыву развіцьця нашай краіны. Міністар Цёппэль, адказваючы на пытаньні беларускага боку, асабліва падкрэсьліў, што прынцыповая пазыцыя фэдэральнага Ўраду да недэмакратычных выбараў у Беларусі нязьменная і стасункі з Расеяй на пазыцыю Эўропы ў гэтым пытаньні не ўплываюць. Наагул, расейскае пытаньне вельмі актыўна абмяркоўвалася зь нямецкімі калегамі. Зь іх боку было адзначана, што палітычная стабільнасьць у Расеі і падтрымка ёй недэмакратычнага рэжыму ў Беларусі – рэчы несумяшчальныя. У сваю чаргу на сустрэчы лідэр беларускай апазіцыі сп. Вячорка адзначыў, што «Беларусь сёньня зацікаўленая, прынамсі, ў захаваньні нэўтралітэту з боку Расеі да палітычных пераменаў унутры краіны, і мы спадзяемся, што Эўропа выкарыстае ўвесь патэнцыял свайго ўплыву, каб прадухіліць умяшальніцтва ва ўнутраныя справы». У выніку працяглай дыскусіі

*працяг на стар. 2*

vytoki.net

3

Пачатак на стар. 1

# ЭЎРОПА ВІТАЕ СВАБОДНУЮ Й НЕЗАПЕЖНУЮ БЕЛАРУСЬ

бакі знайшлі паразуменьне па асноўных пытаньнях. Нямецкім бокам падкрэсьлівалася таксама важнасьць адзінства беларускіх дэмакратычных сілаў. Усе згадзіліся, што адзіны кандыдат ад аб'яднанай апазыцыі на прэзыдэнцкіх выбарах – аптымальны спосаб дэмакратычных пераўтварэньняў у краіне. Бакі згадзіліся, што г. зв. палата прадстаўнікоў ня можа быць прызнаная за легітымны парлямэнт. Беларускія ўдзельнікі зьвярнулі ўвагу на расправу над маніфэстантамі 12 лістапада і атрымалі абяцаньне адрэагаваць на перасьледваньні і расправу рэжыму над свабодалюбівай моладзьдзю.



Падчас сустрэчы лідэраў беларускай апазыцыі з ангельскімі парлямэнтарамі.

У сераду 15 лістапада Беларуская дэлегацыя прыбыла з Брусэлю ў Страсбург. У Эўрапейскім парлямэнце яны мелі спатканьне з кіраўніцтвам спэцыяльнае дэлегацыі Эўрапарлямэнту ў справах Беларусі (Ян Марынус Віерсма, Нідэрлянды; Леанарт Сакрэдэус, Швэцыя; Элізабэт Шродтэр, Нямеччына; Марсэт Кампас, Гішпанія), пасьля чаго выступілі перад сябрамі гэтае дэлегацыі. Эўрапейскія дэпутаты падтрымалі прапанову правесьці адмысловыя слуханьні наконт Беларусі.

17 лістапада адбылася паўгадзінная сустрэча з Найвышэйшым прадстаўніком Эўразьвязу ў справах супольнай міжнароднай палітыкі й бяспекі Хаўерам Салянам у Радзе Эўрапейскага Зьвязу.

Больш культурніцкі накірунак меў візыт у Англію. Разам з сустрэчамі ў Брытанскім парлямэнце і Міністэрстве замежных справаў беларускія апазыцыйныя лідэры разам з англійскімі аналітыкамі й журналістамі прынялі ўдзел у круглым стале, што быў арганізаваны англійскай праваабарончай арганізацыяй «Артыкул XIX».

У размовах з эўрапейскімі лідэрамі закраналіся таксама эканамічныя пытаньні, праблема правоў чалавека ў кантэксьце рэпрэсіяў з боку беларускага ўраду. Закраналіся аспэкты зьнешняй палітыкі. Падчас візыту былі дасягнутыя асноўныя мэты, што мела перад сабой беларуская дэлегацыя, і знойдзеная агульная мова і ўзаемапаразуменьне зь вядучымі палітычнымі сіламі Эўропы.

**Прэсавая група БНФ «Адраджэньне» й Партыі БНФ**

Кроніка

## За зьбіцьцё апазыцыянэра аштрафаваны адзін з членаў жодзінскага РНЕ

***21 лістапада ў жодзінскім судзе разглядалася справа Сяргея Маклака, які 8 кастрычніка падчас Маршу Свабоды, што праходзіў у Жодзіна, ударыў кулаком у твар аднаго з актыўных удзельнікаў акцыі – Алеся Лапіцкага.***

Алесем Лапіцкім была напісаная заява на ўзбуджэньне крымінальнай справы, аднак ўлады адмовіліся ўзбуджаць "крыміналку", і перавялі справу ў адміністрацыйную.

На судзе выступілі сьведкі з абодвух бакоў. Паколькі судзьдзя палічыў сьведчаньні з боку Сяргея Маклака даволі блытанымі, то пад увагу яны не былі прынятыя.

Падчас разгляду справы была доказаная прыналежнасьць Сяргея Маклака да РНЕ, але ў заключнай пастанове жодзінскага суду гэты факт ніяк ня быў адлюстраваны.

У прысудзе прагучала, што Сяргей Маклак ударыў Алеся Лапіцкага з-за ўласных непрыязных адносінаў. Жодзінскага «брытагаловага» вырашана пакараць штрафам на карысьць дзяржавы ў памеры 1 мінімільнай заработнай платы.

**Аляксей ШЭІН**

Рэха

## Прэса пра «ліст афіцэра КДБ»

***У незалежных сродках масавай інфармацыі зьявіліся першыя камэнтары адпаведных службаў адносна ананімнага ліста, атрыманага СМІ ад «афіцэра КДБ» па справе аб зьнікненьні апэратара ОРТ Дзьмітрыя Завадзкага.***

У «Белорусской деловой газете» ад 22 лістапада зьмешчаны каментар супрацоўніка прэс-цэнтру дзяржсакратарыяту Савету бясьпекі, дзе сказана: «Проста так адмахнуцца ад гэтага ліста, спасылаючыся, напрыклад, на яго ананімнасьць, мы, відаць, ня можам. Таму вэрсія, прапанаваная аўтарам ліста, будзе правярацца. Так, як і любая іншая версія. Нельга выключаць таксама, што нейкія факты, выкладзеныя ў дадзеным лісьце, атрымаюць потым пацьверджаньне ў ходзе сьледзтва». Прэс-сакратар МУС Д. Партон для «БДГ» заявіў, што ня можа даць камэнтару, бо гэтая справа не знаходзіцца ў вядзеньні МУС, але выказаў меркаваньне, што абвінавачаньні аўтара ліста ня маюць пад сабой глебы, і хутчэй за ўсё гэта нечыя палітычныя гульні. Прэс-сакратар прэзыдэнта М.Барысевіч сказаў, што «прэзыдэнт нядаўна выказаўся з гэтай нагоды, і да гэтага наўрад ці што можна дадаць».

У той жа час Павел Шарамет, кіраўнік аддзелу спэцпраектаў ОРТ, заявіў, што інфармацыя ананімнага афіцэра КДБ па справе Завадзкага можа мець пад сабой рэальныя падставы. Паводле ягоных словаў, у Маскве ўважліва сочаць за разьвіцьцём падзеяў вакол зьнікненьня апэратара ОРТ. «Падазраваемыя былі затрыманыя ў асноўным дзякуючы ўмяшальніцтву ФСБ Расеі. Вельмі дапамагае міністр унутраных справаў РФ Рушайла. Лукашэнка загнаны ў кут. Яму трэба даваць на сур'ёзныя абвінавачаньні сур'ёзныя адказы, і ня ў духу Азаронка і вар'яцкіх вядучых БТ. Сітуацыя зайшла занадта далёка. Маскву гэта ўжо раздражняе. Яна ўжо сасьпела для таго, каб бачыць на палітычным полі Беларусі новых лідэраў». Па словах самога П.Шарамета, супраць яго 17 лістапада беларуская пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу за фільм пра зьніклых палітыкаў і журналістаў у Беларусі «Дзікае паляваньне», у якім гучыць абвінавачаньне ў гэтых злачынствах у адрас беларускага кіраўніцтва і спэцслужбаў. У органах пракуратуры гэтую інфармацыю пакуль не пацьвердзілі і не абвергнулі.

**Інфармацыйны аддзел ПЦ «Вясна»**


vytoki.net

# ПРАДСТАЎНІКІ БНФ – НА ЗЬЕЗЬДЗЕ НАРОДНАГА ФРОНТУ АЗЭРБАЙДЖАНУ

***На зьездзе Народнага Фронту Азэрбайджана, які адбыўся 28-29 кастрычніка, прысутнічаў намесьнік старшыні БНФ «Адраджэньне» й Партыі БНФ Алесь Бяляцкі.***

Сп. Бяляцкі выступіў з прывітальным словам на зьездзе Партыі Народнага Фронту Азэрбайджана. Выступоўца адзначыў, што мэты беларускага й азэрбайджанскага народнага Фронту фактычна адзіныя. «Мы як партыі адстойваем незалежнасьць сваіх краінаў і аднолькава выступаем за інтэграцыю ў эўрапейскія структуры, у цывілізаваную эўрапейскую супольнасьць» – адзначыў намесьнік старшыні БНФ. Ягонае слова чага эканамічнага супрацоўніцтва ў выпадку зьменаў палітычных рэжымаў. Беларусь зацікаўленая ва ўзаемных кантактах з той прычыны, што Азэрбайджан – краіна багатая на нафту і зьяўляецца важным стратэгічным партнэрам для маладых эўрапейскіх краінаў. Прадстаўнікі БНФ і НФА знайшлі поўную згоду ў гэтых пытаньнях.

Сёньняшняя агульнапалітычная сытуацыя ў Азэрбайджане падобная на беларускую, хоць аўтарытарная ўлада прэзыдэнта Гейдара Аліева (былога генэрала КДБ) абмежаваная шэрагам дэмакратычных нормаў. У краіне існуе больш дэмакратычная за беларускую выбарчая сыстэма, партыі могуць браць удзел у палітычным жыцьці рэспублікі, што дае штуршок і матывацыю для існаваньня і разьвіцьця палітычных партыяў.




*(Зьлева направа): Алесь Бяляцкі, Ульві Хакімаў (нам. старшыні Народнага Фронту Азэрбайджану), Алесь Мазур.*

Народны Фронт Азэрбайджана – найбуйнейшая апазыцыйная партыя ў краіне. Яна налічвае некалькі дзясяткаў тысячаў чалавек (пры агульнай колькасьці жыхароў 8 мільёнаў).

НФА супрацоўнічае зь іншымі дэмакратычнымі партыямі ў нядаўна створаным Дэмакратычным кангрэсе – аб'яднаньні дэмакратычных сілаў. У Кангрэс ўваходзяць таксама партыі «Азадлыг», «Гейрад», «Мусават».

было вельмі цёпла сустрэта азэрбайджанскімі калегамі. Свой выступ Алесь Бяляцкі скончыў лёзунгам азербайджанскіх апазыцыянэраў – «Пераможа народ! Пераможа нацыя! Мы пераможам!» – на азэрбайджанскай мове.

Падчас візыту былі праведзеныя перамовы з кіраўніцтвам Партыі Народнага Фронту Азэрбайджана наконт будучага эканамічнага супрацоўніцтва...

Зьезд партыі праводзіўся ў напружанай атмасфэры, бо пасьля сьмерці кіраўніка Фронту Абульфаза Эльчыбея трэба было абраць новага старшыню. Новым лідэрам быў абраны былы намесьнік у арганізацыйных пытаньнях Мірмахмуд Фатаеў.

**М. САВУШКІНА**



## 18 лістапада ў Берасьці адбылося чарговае паседжаньне Каардынацыйнай Рады «Рэгіянальная Беларусь»

***Як паведаміў Каардынатар Рады Сямён Домаш, прадстаўнікі рэгіёнаў праінфармавалі прысутных аб стварэньні новых каардынацыйных аб'яднаньняў у гарадах Пінск, Баранавічы, Навапалацак, Полацак і Вorша. Гэтым аб'яднаньням прапанавана далучыцца да дзейнасьці Каардынацыйнай Рады «Рэгіянальная Беларусь»***

Была заслухана інфармацыя аб выніках нядаўніх выбараў у так званую Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны. Адзначана, што ўдзел у нагляданьні дэмакратычных партый і арганізацый паслужыў добрай практыкай для арганізацыі пільнага грамадскага кантролю ў час будучай прэзыдэнцкай кампаніі.

Каардынацыйная Рада «Рэгіянальная Беларусь» падтрымала намаганьні КРДС па вылучэньні адзінага кандыдата ў прэзыдэнты ад дэмакратычных сілаў. Выказана пажаданьне паскорыць гэты працэс, каб не пазьней студзеня 2001 года гэта пытаньне было вырашана на Кангрэсе Дэмакратычных Сілаў. Усебакова абмеркаваны і распрацаваны магчымы мэханізм вылучэньня адпаведнага кандыдата. Прапанова будзе ўнесена ў КРДС. Для правядзеньня інфармацыйнай работы, збору подпісаў, агітацыйна-масавай работы, арганізацыі кантролю будучых прэзыдэнцкіх выбараў Каардынацыйная Рада заклікала ўсе рэспубліканскія і рэгіянальныя дэмакратычныя арганізацыі неадкладна пачаць стварэнне цэнтральнага, абласных і раённых штабоў па падрыхтоўцы і ўдзелу дэмакратычных сілаў у маючых адбыцца прэзыдэнцкіх выбарах.

Удзельнікі паседжаньня станоўча ацанілі ўтварэньне і дзейнасьць дэмакратычнай моладзевай кааліцыі «Пераменаў!». Вырашана аказваць ёй усебаковую падтрымку.

Пацьверджана рашэньне аб узнагароджаньні «Рэгіянальнай газеты» (г. Маладэчна) каштоўным падарункам за шырокае асьвятленьне мясцовых падзей.

Каардынацыйнай Радай сумесна з Беларускай Асацыяцыяй журналістаў абвешчаны конкурс сярод недзяржаўных газэт на лепшае адлюстраваньне дзейнасьці рэгіянальных няўрадавых грамадзкіх, палітычных, прафсаюзных арганізацый і іх аб'яднаньняў. Пераможца будзе вызначаны па выніках работы за паўгодзьдзе, атрымае дыплём і каштоўны падарунак.

**Антон ЛАБОВІЧ**


vytoki.net

# МАЛАДЗЁВАЯ АКЦЫЯ «ПЕРАМЕНАЎ!» БЫЛА ЖОРСТКА РАЗАГНАНАЯ Ў МЕНСКУ



*Хапалі ўсіх: маладых людзей, непаўнагадовых і дзяўчат.*

***Моладзь не пайшла на Бангалор. Рэжым адрэагаваў з усёй сваёй жорсткасьцю.***

Ужо за некалькі гадзінаў да пачатку акцыі «Пераменаў!» у Менску на праспэкце Ф.Скарыны было заўважана больш за дзесяць машынаў са спэцназам і вайскоўцамі.

А 18-й гадзіне некалькі тысячаў маладых людзей, якія вырашылі патрабаваць зьменаў у Беларусі, сабараліся ля Акадэміі навук. Гэтае месца арганізатары акцыі вызначылі для збору ўдзельнікаў шэсьця – адпаведная заяўка была пададзеная ў гарвыканкам. Аднак улады забаранілі і сам збор, і шэсьце, адправіўшы моладзь зьбірацца на задворках, у Кіеўскім сквэры, і адтуль ісьці на сумнавядомы пляц Бангалор. Арганізатары адмовіліся ад такога ганебнага фармату акцыі і на Бангалор не пайшлі.

У 18.25 калёна рушыла праспэктам Скарыны ў цэнтар гораду, да Кастрычніцкай плошчы. У гэты ж самы час вялікая частка моладзі была адсечаная міліцэйскімі кардонамі на скрыжаваньні пр. Скарыны й вуліцы Сурганава, а таксама ля кінатэатру «Кастрычнік». Асататтняя моладзь, аднак, пайшла наперад. У неба ўзьвіліся некалькі ракетаў, моладзь сьвісьцела ў сьвісткі, чуліся выбухі пэтардаў.

Да Акадэміі навук і прылеглых вуліцаў у той час былі сьцягнутыя беспрэцэдэнтныя сілы міліцыі й амону.

Быў перакрыты рух, не хадзілі тралейбусы і аўтобусы, на ст. мэтро «Акадэмія Навук» не спыняліся цягнікі.

На падыходзе да пляцу Якуба Коласа, перад ЦУМам, праспэкт быў перакрыты некалькімі шэрагамі амонаўцаў у поўнай экіпіроўцы. Моладзь спынілася перад кардонамі, не жадаючы ісьці на рэзкае абвастрэньне сытуацыі. Аднак празь некалькі хвілінаў амон пайшоў у наступ. Пачаўся «хапун». Хапалі ўсіх: маладых людзей, непаўнагадовых і дзяўчат дзясяткамі запіхвалі ў міліцэйскія грузавікі, аўтобусы й машыны. Затрымлівалі таксама і выпадковых сьведкаў акцыі. У гэты ж час моладзь, якая вырашыла адысьці назад, з вуліцы Дарашэвіча была адсечаная міліцыяй. У дварах за крамай «Белвэст», куды хлынула частка моладзі, адбыліся жорсткія сутычкі. Некалькі маладых чалавек былі моцна зьбітыя міліцыянатамі.



*Каля ЦУМу праспэкт перакрылі некалькі шэрагаў амонаўцаў у поўнай экіпіроўцы.*

Аўтобусы й машыны, у якіх не выпускаючы трымалі затрыманых, стаялі ля ЦУМу (9 вялікіх і 9 малых), ля Першамайскаага РАУСу – 6 і каля Партызанскага РАУСу – 8 аўтобусаў з затрыманымі.

Паводле зьвестак Маладзёвай Кааліцыі «Пераменаў!», было затрымана каля 300 чалавек. Па афіцыйных зьвестках – 112 чалавек.

Улады ўчынілі, фактычна, разгром маладзёвай акцыі. Вялізная колькасьць міліцыі, амону, тэхнікі, сірэны на вуліцах, – усё гэта было выкарыстана дзеля запалохваньня моладзі.

Маладзёвая Кааліцыя "Пераменаў!" заяўляе, што ні запалохваньні, ні рэпрэсіі ня змогуць спыніць беларускую моладзь, якую дастала жыцьцё без свабоды й без пэрспэктывы, у краіне, дзе пануе аўтарытарны рэжым. Дыктатура й той, хто гэтую дыктатуру ўсталёўвае, сыйдуць у нябыт, а гісторыю новай, прыгожай Беларусі будзе пісаць моладзь, якая сёньня патрабуе ПЕРАМЕНАЎ!

# Акцыя «Пераменаў!» адбылася ў рэгіёнах Беларусі

У **МАГІЛЁВЕ** каля 30 сяброў маладзёвых арганізацыяў гораду ўзялі ўдзел у рэканструкцыі абласнога драматычнага тэатру. Будынку, у якім месьціцца тэатар, сёлета споўнілася 112 год; цягам апошніх дзесяці ён знаходзіцца на «доўгатэрміновай» дзяржаўнай рэстаўрацыі. Маладзёвую акцыю здымала рэгіянальная тэлекампанія «Магілёў – 23».

12 лістапада ў Магілёве зранку аказаліся залітымі фарбай мэмарыяльныя дошкі кшталту «Борцам за советскую власть», што віселі ў цэнтры гораду.

Сябры магілёўскага Маладога Фронту памянялі некалькі расейскамоўных шыльдаў на крамах пры атрыманай падтрымцы адміністрацыі гандлёвых установаў.

А 16.00 у памяшканьні Магілёўскага Дзяржаўнага ўнівэрсытэту ў рамках акцыі «Пераменаў!» адбыўся турнір «Што? Дзе? Калі?». У ім удзельнічала 15 камандаў гораду – агулам больш за 200 чалавек. Турнір ладзіўся на аснове беларускай тэматыкі.

А 19.00 у мясцовым кінатэатры «Космас» мусіла адбыцца беларускамоўная дыскатэка. Але ў 17.00 у памяшканьні адключылі сьвятло. А перад гэтым прыйшлі прадстаўнікі гарвыканкаму праверыць рэпэртуар дыскатэкі.

***працяг на стар. 5***

пачатак на стар. 4

# Акцыя «Пераменаў!» адбылася ў рэгіёнах Беларусі

У цэнтры **ВОРШЫ** 12 лістапада а 13.00 адбыўся несанкцыянаваны мітынг, у якім узялі ўдзел больш за 80 чалавек з Маладога Фронту, Задзіночаньня Беларускіх Студэнтаў, маладзёвых арганізацыяў «Зьвяз», «Крывіч». Падчас акцыі былі раздадзеныя буклеты арганізацыяў й маладзёвыя выданьні «Моладзь – За!», «Залік» агулам больш за 2 тысячы асобнікаў. За акцыяй назіралі некалькі асобаў з адміністрацыяў навучальных установаў гораду, а таксама «члены» БПСМ. На ўсе заклікі пікетоўцаў да апошніх памяняць БПСМ-аўскія пасьведчаньні на прызы, кіраўніцтва БПСМ сьціпла адмоўчвалася ці сарамліва адводзіла вочы. Варта адзначыць, што гэта была першая ўласна маладзёвая акцыя ў Воршы – падобных па масавасьці мерапрыемстваў у горадзе не праводзілася з 1991 году.

**У БАРАНАВІЧАХ** 12 лістапада з 14.00 да 15.00 быў зладжаны несанкцыянаваны мітынг, у якім узялі ўдзел больш за 50 чалавек. Прысутным раздаваліся паветраныя шарыкі з надпісам «Моладзь патрабуе пераменаў!» і спэцвыпуск «Весьніка» Маладога Фронту.

А 17 гадзіне на мосьце пры ўезьдзе ў горад былі вывешаныя два бел-чырвона-белыя сьцягі й вялікі плякат «Моладзь патрабуе пераменаў!»

**У ГОРАДНІ** міліцыяй разагнаны несанкцыянаваны пікет «Пераменаў!». Згодна заканадаўству на пікет была пададзеная заяўка ў гарвыканкам. Аднак улады перанесьлі месца і час правядзеньня пікету (маладых людзей адправілі на ўскраек гораду пікетаваць у 17.00).

Гарадзенская моладзь вырашыла правесьці акцыю так, як было запланавана. Пікет пачаўся а 15.00 ля Дому Сувязі ў цэнтры Горадні. Удзел у ім узялі больш за сорак чалавек з Маладога Фронту й Маладой Грамады. Удзельнікі раздавалі мінакам улёткі «Пераменаў!» і газэту «Дзіда». Праз 15 хвілінаў ад пачатку акцыя была спыненая міліцыянтамі. Былі арыштаваныя арганізатары: старшыня Гарадзенскага Маладога Фронту Андрэй Мялешка й старшыня Маладой Грамады Сьвятлана Нех. Усяго было затрымана 15 чалавек – іх завезьлі ў Ленінскі РАУС, дзе далі позвы ў суд. Суды былі перанесеныя на 14 лістапада.

Старшыню Гарадзенскай арганізацыі «МФ» Андрэя Мялежку, яго намесьніка Вадзіма Саранчукова і намесьніцу старшыні Маладой Грамады Сьвятлану Нех абвінавачваюць у арганізацыі як несанкцыянаванага пікету «Пераменаў!», так і «Маршу Свабоды», які праходзіў 8 кастрычніка.

**У БЕРАСЬЦІ** акцыя пачалася яшчэ 11 лістапада. Сябры Маладога Фронту зладзілі на вул. Савецкай публічныя чытаньні вершаў клясыкаў беларускай літаратуры: Адама Міцкевіча, Янкі Купалы, Ніла Гілевіча й інш. Па сканчэньні чытаньняў маладафронтаўцы ўсклалі вянок да помніка Адаму Міцкевічу. Кіраўнік Берасьцейскага МФ, намесьнік старшыні МФ Сяржук Бахун распавёў прысутным, у тым ліку прадстаўнікам СМІ, пра акцыю «Пераменаў!».

12 лістапада

У цэнтры Берасьця з 13.00 да 13.30 адбываўся несанкцыянаваны пікет, на якім прысутнічала больш за 20 сябраў Маладога Фронту.

**У НАВАПОЛАЦКУ** 11 лістапада адбыўся сход маладзёвых арганізацыяў (МФ, экалягічная арганізацыя «Крок Разам», Незалежны Прафсаюз Студэнтаў, гістарычны клюб «Княжыч», мясцовае аддзяленьне «Вясны», Краязнаўчы Клюб «Валацугі»). Быў прыняты зварот «Моладзь прагне пераменаў!» і рашэньне аб выданьні агульнамаладзёвай Наваполацкай газэты, першы нумар якое будзе прысьвечаны акцыі «Пераменаў!».

Зраніцы 12 лістапада сьцены ў **БАРЫСАВЕ** былі расьпісаныя заклікамі «Пераменаў!».

Аб 11 гадзіне на Цэнтральнай плошчы адбыўся несанкцыянаваны пікет. Удзельнічала ў ім больш за 10 чалавек з Маладой Грамады. Праз пяць хвілін ад пачатку на месца пікету прыехалі міліцэйскія машыны. Узброенымі міліцыянтамі былі затрыманыя непаўнагадовыя удзельнікі акцыі Міхась Кузьняцоў, Алена й Марына Ясюк.

Раніцай 12 лістапада па ўсім **БАБРУЙСКУ** зьявілася больш за 100 надпісаў «Моладзь прагне пераменаў!», «Пераменаў!».

11 лістапада ў адной з сярэдніх школаў **МАЛАДЭЧНА** была зарганізаваная шырокамаштабовая маладзёвая дыскатэка «Пераменаў!».

12 лістапада на Цэнтральнай плошчы Маладэчна сябрамі Маладога Фронту, Маладой Грамады й Таварыства Беларускае Мовы быў зладжаны пікет «Пераменаў!»

Улады **ВІЦЕБСКУ** забаранілі прадстаўнікам Кааліцыі праводзіць маладзёвую акцыю «Пераменаў!». У рамках акцыі мусілі адбыцца шэсьце й мітынг. У сувязі з гэтым маладзёвыя арганізацыі прынялі адмысловую заяву.

12 лістапада ўвечары сябры МФ правялі ў Віцебску невялікае шэсьце да Успенскай гары, зь якой менавіта ў гэты дзень некалькі стагодзьдзяў назад быў скінуты вуніяцкі сьвятар Язафат Кунцэвіч. Каля 20 чалавек прайшлі са сьвечкамі праз цэнтар горада і ўшанавалі памяць сьвятара.

12 лістапада на будынку **СЬВЕТЛАГОРСКАГА** Індустрыяльнага тэхнікуму быў вывешаны бел-чырвона-белы сьцяг, які зьнялі літаральна праз 5 хвілінаў. Па горадзе зьявіліся графіці «Моладзь прагне пераменаў!»

У ноч з 11 на 12 лістапада у цэнтры **РЭЧЫЦЫ** на пад'ёмным кране адной з будоўляў зьявіўся вялікі бел-чырвона-белы сьцяг. Па ўсім горадзе былі зробленыя надпісы «Пераменаў!», «Жыве Беларусь!».

На самых высокіх будынках у цэнтры **ЖОДЗІНА** зранку 12 лістапада луналі 2 бел-чырвона-белыя сьцягі.

**У БЯЛЫНІЧАХ** (Магілёўская вобл.) 12 лістапада прайшоў канцэрт, прымеркаваны да акцыі «Пераменаў!», з удзелам магілёўскіх бардаў і бялыніцкага рок-гурта.

У 11.00 12 лістапада ў **КОХАНАВЕ** (Віцебская вобл.) сябры МФ і «Краю» раздавалі на Цэнтральнай плошчы газэту «Золак» з інфармацыяй пра акцыю «Пераменаў».

У старажытным культурным цэнтры краіны горадзе **НЯСЬВІЖЫ** адбылася маладзёвая вечарына, у якой удзельнічалі дзясяткі маладых людзей. Некалькі прысутных «членаў» БПСМ прынесьлі й здалі свае пасьведчаньні.

**У СЛУЦКУ** з 11 на 12 лістапада былі распаўсюджаныя ўлёткі з прапановай да «членаў» БПСМ выкінуць свае пасьведчаньні ці абмяняць іх на прызы.

У **СЛОНІМЕ** 12 лістапада прайшла прэзэнтацыя кнігі «Паэтычная Слонімшчына», прымеркаваная да кампаніі «Пераменаў». Удзел у ёй прынялі больш за 50 чалавек.

У **КРЫЧАВЕ** з 12.00 да 13.00 прайшоў пікет з удзелам сябраў МФ. Некалькі сябраў БПСМ спалілі свае пасьведчаньні.

Пад вечар 12 лістапада у цэнтры **РАДАШКОВІЧАЎ** зьявілася пад вечар 12 лістапада некалькі бел-чырвона-белых сьцягоў.

На станцыях **НАВАСАДЫ** і **КАЛОДЗІШЧЫ**, што каля Барысава, былі вывешаныя некалькі бел-чырвона-белых сьцягоў.

Акцыі адбыліся ў **ШКЛОВЕ, ГОМЛІ.**

Пікеты ў рамках акцыі «Пераменаў» былі забароненыя ўладамі **СЬВЕТЛАГОРСКУ, ПІНСКУ й БЯРОЗЫ.**

**Інфармацыйны Цэнтар кааліцыі «ПЕРАМЕНАЎ!»**



vytoki.net

# Беларуская Бездань

***Несапраўдныя вынікі несапраўдных выбараў у несапраўдны парлямэнт-іншымі словамі, усё па-старому ў беднай Беларусі. Яе паўночныя і заходнія суседзі Польшча, Латвія ды Літва імкнуцца ў Эўразію, і, хутчэй за ўсё, праз некалькі год яны будуць там. У іх улада пераходзіць з рук у рукі мірна і спакойна. Палітычнае ж становішча Беларусі выстаўляе нават суседку з Усходу як краіну, дзе квітнее дэмакратыя.***



Вартае жалю сёньняшняе становішча Беларусі кідае цень на пэрспэктыву ўзьяднаньня з Расеяй. Хаця Пуцін у прынцыпе хацеў бы далучыць Беларусь да сваіх уладаньняў, застаецца незразумелым, як ён бачыць ролю Лукашэнкі ва ўсім гэтым працэсе – ці той больш схільны дапамагаць, ці перашкаджаць. 19-га кастрычніка «двойка» мусіла пацьвердзіць жаданьне абедзьвюх краін да яднаньня.

*Расчараваны, ізаляваны, але ўсё яшчэ моцны Лукашэнка адчувае, што трэба падкруціць гайкі.*

На пачатку гэтага году беларускія ўлады паабяцалі міжнародным арганізацыям, што апаненты Лукашэнкі атрымаюць належны доступ да СМІ, роўныя шанцы і магчымасьці перад выбарамі і ім за гэта нічога ня будзе. Далей – болей: выбарчае заканадаўства будзе зьмененае, а парлямэнт атрымае болей паўнамоцтваў. Калёсы і зараз там – аніводнае з гэтых абяцаньняў не было выканана.

Выбарчае заканадаўства дазволіла ўладам выключыць зь перадвыбарчай кампаніі зь дзясятак незалежных кандыдатаў і падтасаваць вынікі. Нягледзячы на тое, што ўсе кандыдаты мелі хвіліну-другую ў эфіры, падкантрольная дзяржаве СМІ вялі актыўную прапаганду, абвінавацьўшы апазыцыю ва ўсіх грахах і абазваўшы яе актывістаў фашыстамі, наркаманамі, злачынцамі, амэрыканскімі прысьпешнікамі ды гомасэксуалістамі. Дзякуй, што хоць не ўсімі «тытуламі» адразу. Апазыцыянэры, што раздавалі ўлёткі за байкот, трапілі ў пастарунак. А незалежнасьць і большая паўнамоцтвы новага парлямэнту – чарговы міф.

Так ці інакш, большасьць апазыцыі байкатавала выбары. Міжнародныя структуры кшталту АБСЭ, Рады Эўропы (зборышча гаваруноў) і Эўрапарлямэнту схаваліся за сьціплай шыльдаю «тэхнічныя назіральнікі», палічыўшы, што галасаваньне не адпавядае мінімальным патрабаваньням «празрыстасьці».

Лукашэнка спадзяваўся на 70 адсоткаў яўкі выбаршчыкаў. Афіцыйныя вынікі падалі лічбу 60. Нязграбныя зводкі у вечары дзень выбараў і зафіксаваныя факты падману апусьцілі плянку на 45 адсоткаў, што недастаткова для таго, каб выбары адбыліся.



Іншыя прыкметы, як незадаволенае варчаньне ў дагэтуль паслухмяных афіцыйных прафсаюзах, наводзяць на думку, што хватка Лукашэнкі паслабела. Але, здаецца, ён ізноў выйшаў сухім з вады, напляваўшы на ўсе правілы дэмакратыі. Ён застаецца рэальным носьбітам улады. Шэрагі апазыцыі выкашаны масавымі зьнікненьнямі лідэраў, чый лёс, часам, дагэтуль невядомы. Крытыка палітычнага курсу Аляксандра Рыгоравіча за мяжою ня мае аніякага эфэкту.

Уся ўвага зараз пераключаецца на лістапад наступнага году – патэнцыйную дату прэзыдэнцкіх выбараў. Сёлетнія парлямэнцкія выбары могуць разглядацца як гэнэральная рэпэтыцыя. Але паміж тады і зараз паўстаюць тры важкія пытаньні. Па-першае, ці здолее апазыцыя аб'ядноць свае намаганьні па-за сьпіной вартага даверу кандыдата, напрыклад, постаці кшталту сэрба Ваіслава Каштуніцы. Па-другое, як адрэагуе Лукашэнка, калі на першае пытаньне адказ будзе пазытыўны. Трэцяе – што будзе рабіць Расея ў гэтай складанай сытуацыі.

*Але, здаецца, ён ізноў выйшаў сухім з вады, напляваўшы на ўсе правілы дэмакратыі.*

А пакуль апазыцыя застаецца слабай і расколатай на два лягеры. У адным – беларускія нацыяналісты, для каго першая задача – спыніць русіфікацыю. У другім – болей ліберальныя палітыкі. Іх прыярытэт – паварот да дэмакратыі і пазбаўленьне ад рэжыму Лукашэнкі. Аднаўленьне беларускае мовы і культуры адыходзіць на другі плян. Хаця апошнім часам раскол і трэньні крыху суцішыліся. «Нават лібэральныя дэмакраты стаяць на пра-

незалежніцкай пазыцыі», кажа Андрэй Саньнікаў.

Але спрэчкі не сьціхаюць. Складанасьці дадае прынцыповае разыходжаньне амэрыканскае і нямецкае пазыцыі ў дачыненьні да Беларусі. АБСЭ ў Менску і спадар Вік пэрсанальна ратуюць за цярплівасьць і перамовы. Некаторыя дзеячы знаходзяць гэтую пазыцыю занадта мяккай. Зянон Пазьняк абвінавачвае Віка ў «садзейнічаньні акупацыі Беларусі і распаўсюду Расейскай імпэрыі». Амэрыканскія дыпляматы і праваабаронцы стаяць на больш жорсткай пазыцыі і нават разглядаюць змаганьне за дэмакратыю на Беларусі як першае сутыкненьне ў новай халоднай вайне з Расеяй.

Расчараваны, ізаляваны, але ўсё яшчэ моцны Лукашэнка адчувае, што трэба падкруціць гайкі. Напярэдадні выбараў міліцыя зрабіла налёт на галоўную незалежную выдавецкую кампанію. Масавыя зьнікненьні і арышты, рэпрэсіі могуць набыць павальны характар. Ёсьць небясьпека ўсталяваньня надзвычайнай сытуацыі перад прэзыдэнцкімі выбарамі.

Самыя апантаныя ворагі рэжыму на ўсю гавораць пра «Югаслаўскі сцэнар» у дачыненьні да Лукашэнкі. Аднак умовы ў Менску і Бялградзе вельмі і вельмі розьняцца. Па-першае, людзі больш абыякавыя, па-другое, пачуцьцё нацыянальнае самасьвядомасьці менш разьвітае, а апазыцыя слабейшая. Усё большая колькасьць людзей спаўзае за мяжу беднасьці, але пакуль Расея будзе пастаўляць танныя энэргарэсурсы, эканоміка так-сяк будзе трымацца.



*Некаторыя беларусы галасуюць за ўчорашні дзень.*

«Здаецца, што мы ізноў жывем у Савецкім Саюзе», сьцьвярджае адзін зь вядучых беларускіх сацыёлягаў, які не пажадаў назваць сваё імя. «Усе рашэньні прымаюцца ў Маскве». Так ці інакш, Пуцін звысока паглядае на Беларусь і яго сапраўдныя адносіны да набіўшага аскоміну саюзу застаюцца загадкаю.

Штаб Лукашэнкі запэўнівае, што Беларусь застанецца незалежнай, нават калі працэдура аб'яднаньня завершыцца. Расея адцягнула ўвядзеньне агульнае валюты да 2005 году (фактычна на нявызначаны тэрмін), але яна мае ад Беларусі амаль усё, што хоча: даверылую асобу ў міжнародным гандлі зброяй, перадавую базу для разьмяшчэньня сваіх радараў і вайсковых частак і ракет, каб прыпужаць НАТА, калі тая раптам надумае сунуцца ў Балтыйскія краіны.

І хаця некаторыя расейскія магнаты зацікаўлены ў яднаньні, паўнавартаснае зьліцьцё дзьвюх краінаў падаецца вельмі далёкай пэрспэктывай.

**Пераклад з**
**TheECONOMIST**

*Працяг. Пачатак у нумары 10*

# ІНСТЫТУТ ПРЭЗЫДЭНТА

**Іван САВЕРЧАНКА**



Вылучэньне адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў краіны – і тэарэтычна, і тэхналягічна цалкам выканальная задача. Галоўныя этапы на гэтым шляху: а) стварэньне Кансультацыйных групаў, паўнамоцтвы якіх пацьверджаны найвышэйшымі палітычнымі органамі партыяў; б) падрыхтоўка Мэмарандуму – пагадненьня пра ўзаемныя абавязкі палітычных сілаў дэмакратычнай арыентацыі; в) публічнае падпісаньне глыбока прапрацаваных узаемных абавязкаў.

У пагадняльных дакумэнтах мусяць быць выразна і дэталёва акрэсьленыя ўсе палітычныя ўмовы і канкрэтныя патрабаваньні да адзінага кандыдата і прынцыпы дзейнасьці адзінай каманды. Яны ўлучаюць тры праблемныя блёкі: а) асабістыя вартасьці лідэра, б) палітычную праграму, в) функцыі кіраўніка дзяржавы і ступень уплыву дзяржаўнай бюракратыі на грамадзкія працэсы. Сярод асабістых вартасьцяў кандыдата, відавочна, павінны быць: прафэсійны досьвед у сфэры палітычнага мэнэджмэнту, адданасьць беларускасьці, набыткі на ніве дэмакратызацыі грамадзтва ды інш. Ключавое значэньне мае агульная палітычная праграма, узгодненая сыстэма канцэптуальных, інстытуцыянальных, прававых і функцыянальна-кадравых прыярытэтаў на пяці асноўных узроўнях – сацыяльная сфэра, палітычныя інстытуты, гаспадарка, духоўнае жыцьцё, міжнародныя дачыненьні. Нарэшце, бальшыня функцый у сыстэме выканаўчай улады павінна быць у значнай ступені зьмешчана ад кіраўніка дзяржавы да прэм'ера. Сярод абавязкаў прэзыдэнта мусяць дамінаваць прадстаўнічыя і агульнапалітычныя, што больш чым дастаткова.

У змаганьні дэмакратычных сілаў за прэзыдэнцкую пасаду надзвычай істотны і тэхналягічны момант – выразная акрэсьленасьць дзеяньняў і максымальная эфэктыўнасьць крокаў на кожным з этапаў: старту, рэгістрацыі кандыдатаў, уласна выбарчай кампаніі. Сёньняшні палітычны расклад сілаў, перадвыбарчых зародкавых ядраў паказвае – неаднародныя прамаскоўскія палітыка-эканамічныя кляны і дзейны рэжым выстаўяць на старт, прынамсі, трох кандыдатаў. Ад незалежніцкіх і дэмакратычных сілаў краіны будуць, верагодна, стартаваць ня менш за чатыры кандыдаты, што цалкам аптымальна, бо дазволіць істотна мінімізаваць рызыку, а таксама створыць спрыяльныя ўмовы для пасьпяховай гульні на стракатым электаральным полі, дасьць магчымасьць выбіраць неабходныя інструмэнты і рабіць выгодныя тактычныя манэўры на кожным з этапаў.

 vytoki.net 

## Маладыя горадзенскія актывісты атрымалі «дарослае» пакараньне

22 лістапада ў судзе Ленінскага раёна г. Горадні разглядалася справа старшыні Горадзенскай арганізацыі «Маладога Фронту» Андрэя Мялешкі. Ён абвінавачваўся ў арганізацыі несанкцыянаванага пікету «Пераменаў!» 12 лістапада і ва ўдзеле ў несанкцыянаваным шэсьці 8 кастрычніка – «Марш Свабоды» ў Горадні. Судзьдзя Дзьмітрый Дзенчанка вынес прысуд: 170 мінімальных заробкаў.

23 лістапада было вынесенае папярэджаньне намесьніку старшыні Горадзенскай арганізацыі «Малады Фронт» Вадзіму Саранчукову за ўдзел у Маршы Свабоды, што адбываўся ў Горадні 8 кастрычніка.

У судзе Ленінскага раёна 23 лістапада вырашылася справа старшыні Горадзенскай «Маладой Грамады» Сьвятланы Нех. Яе прыцягнулі да адказнасьці за арганізацыю несанкцыянаванага пікету 12 лістапада «Пераменаў!», а таксама за арганізацыю горадзенскага «Маршу Свабоды» 8 кастрычніка. Сьвятлане Нех, у адносінах да якой ўжылі грубую фізычную сілу пры затрыманьні, трэба заплаціць дзяржаве 150 мінімальных заробкаў.

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**

## АПЕСЬ АСТРОЎСКІ

*Сябра Сойму БНФ, старшыня камісіі па грамадзкіх сувязях пры БНФ*



*Нарадзіўся 19 сакавіка 1957 года.*

*У 1974 г. паступіў, а ў 1980 г. з адзнакай скончыў Гарадзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут. Адукацыя – лекар лячэбнік.*

*У сьнежні 1985 г. абараніў кандыдацкую дысэртацыю па праблеме рэгэнэрацыі мышцаў. Кандыдат біялягічных навук.*

*У 1993 годзе атрымаў навуковую ступень Доктар мэдыцынскіх навук, а ў 1994 годзе навуковае званьне – прафэсар.*

*З 1980 г. па гэты час працуе на катэдры біялёгіі Гарадзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўнівэрсытэту.*

*Мае больш за 70 навуковых прац, 6 вынаходніцтваў. Сябра Нюёркскай Акадэміі навук.*

*Сваю грамадзкую дзейнасьць пачаў у 1986 годзе, калі быў адчынены гарадзенскі клюб "Паходня".*

*У Беларускім Народным Фронце з самага яго заснаваньня. З 1993 г. сябра гарадзенскай рады БНФ. З 1997 сябра сойму БНФ, намесьнік старшыні камісіі па прапагандзе пры БНФ.*

*З 2000 г. старшыня камісіі па грамадзкіх сувязях пры БНФ.*

*Старшыня гарадзенскай арганізацыі Таварыства вышэйшай беларускай школы. Намесьнік старшыні каардынацыйнага камітэту гарадзенскай ініцыятывы.*

*Жанаты, мае трох дзяцей.*

Сваю заяву на ўступленьне ў Партыю БНФ Вы можаце дасылаць на адрас:
**220005, г. Менск, вул. Варвашэні, 8, Управа Сойму Партыі БНФ**

**Ва Ўправу Сойму Партыі БНФ Грамадзяніна Беларусі**

_______________________
(прозьвішча)

_______________________
(імя)

_______________________
(імя па бацьку)

**які нарадзіўся «___» ______________ 19__ г**

**жыве па адрасе:** ______________
(індэкс і поўны адрас)

_______________________

**род заняткаў:** ______________

**тэл.** ______________

**ЗАЯВА**

**Прашу прыняць мяне ў Партыю БНФ. Праграмныя палажэньні БНФ «Адраджэньне» падзяляю. Абавязуюся выконваць Статут Партыі БНФ.**

_____________ (дата)

_____________ (подпіс)

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/12 sprava 7Н 15

НавіНЫ
Б Н Ф «АДРАДЖЭНЬНЕ»
№ 13 (30), 25 лістапада 2000 г, наклад 299 асобнікаў
…аецца бясплатна на правах нут…
…нтацыі.

У нумары скарыстаная выява Пагоні з тытульнага аркуша Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.
Адрас для ліставаньня: 220006, Менск, а/с 27, тэл. 284-50-12
E-mail: bnf@journalist.com
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч
рэдактар нумару Аляксей Шэін

У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia

vytoki.net